А. С. Карачун, А. С. Пархоменка

# АРХІТЭКТУРНАЯ ПЕРЛІНА БЕЛАРУСІ: НЯСВІЖСКІ КЛЯШТАР БЕНЕДЫКТЫНАК

*Разглядаюцца асаблівасці стварэння і архітэктурныя адметнасці Нясвіжскага кляштара бенедыктынак.*

Нясвіж невыпадкова называюць перлінай Беларусі. Яго архітэктурныя помнікі, гісторыя і культура атрымалі шырокую вядомасць як ў нашай краіне, так і за мяжой. Штогадова больш за 100 тысяч айчынных і замежных турыстаў наведваюць горад-помнік. Аднак не ўсе экскурсійныя маршруты ўключаюць наведванне Нясвіжскага кляштара бенедыктынак, уключанага ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. На жаль, існуе надзвычай мала публікацый, прысвечаных гісторыі кляштара.

Трэба адзначыць, што неабходнасць стварэння ў XVI ст. новай абарончай сістэмы горада, ажыццяўленне праграмы ўладальніка Нясвіжа Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі па рэстаўрацыі каталіцызму, а таксама рэалізацыі ідэй стварэння культурна-выхаваўчага цэнтра для жанчын-каталічак сталі асноўнымі перадумовамі будаўніцтва ў Нясвіжы першага на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага кляштара бенедыкцінак.

Бенедыктынкі былі вельмі распаўсюджаным у Еўропе жаночым манаскім ордэнам, праслаўленым асветніцкай дзейнасцю, дасягненнямі ў кніжным мастацтве і музыцы. Ажыццявіць ідэю адкрыцця іх кляштара ў Нясвіжы ўдалося з вялікімі цяжкасцямі. Актыўны ўдзел у гэтай справе прымала жонка М.К. Радзівіла Эльжбета Яўфімія з рода Вішнявецкіх. Фундацыя кляштара была зацверджана ў канцы 1590 г., першыя манашкі прыбылі з г. Хелмна ў 1591 г., але будаўніцтва кляштарнага ансамбля пачалося толькі ў 1593 г. У ім кляштар і касцёл св. Яўфіміі былі злучаны з навучальнай установай для жанчын і шпіталем. Нясвіжскі кляштар бенедыкцінак – з'ява ўнікальная, увасобіўшая ўжо на момант стварэння традыцыі і наватарства. З аднаго боку, у яго стройных прапорцыях было нешта сярэднявечнае, аднак многія элементы сведчаць пра рэнесансавыя прыёмы будаўніцтва. Адначасова архаічныя гатычна-рэнесансавыя формы тут спалучыліся з новай трактоўкай ансамбля і дэкаратыўнай пластыкай, характэрнай для барока. Улічваючы новыя падыходы, што з'явіліся ў заходнееўрапейскай архітэктуры таго часу, стваральнікі Нясвіжскага кляштара бенедыктынак пастараліся ўлічыць усё неабходнае і распрацавалі прынцыпова новую канцэпцыю кляштарнага комплекса, для якой была характэрна адкрытасць унутранай прасторы, што на той час было наватарствам. Гэтыя ідэі ў многім былі ўспрыняты пры будаўніцтве аналагічных комплексаў на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў наступныя гады. Складовай часткай архітэктурнай пабудовы кляштарнага комплекса быў касцёл св. Яўфіміі – адзін з самых цікавых помнікаў культуры Нясвіжа. Яго алтарная разьба і жывапіс з'яўляюцца ўнікальным комплексам твораў барока і ракако ў Беларусі. Алтар, амбон і арган касцёла былі перавезены ў касцёл у Новай Мышы. Ступень іх захаванасці сведчаць аб магчымасці аднаўлення першапачатковага выгляду ўнутранага аздаблення касцёла – помніка культуры рэспубліканскага значэння. Канчаткова кляштар бенедыктынак быў зачынены ў 1945 г. У пасляваенны перыяд у будынку кляштара размяшчаліся:

- Педагагічнае вучылішча (1945 – 1956);
- Школа-інтэрнат (1956 – 1984):
- Педагагічнае вучылішча (з 1984г.), зараз – Нясвіжскі дзяржаўны каледж імя Я. Коласа.

Такім чынам, Нясвіжскі кляштар бенедыктынак па задуме яго заснавальнікаў быў заклікаҥы выконваць некалькі функцый: абарончую, рэлігійную, культурна-асветніцкую. Ён іграў важную ролю ў справе жаночага выхавання і адукацыі на беларускіх землях на працягу XVI – XIX вв. У наш час – гэта ўнікальны помнік гісторыка-культурнай спадчыны, захаванне якога – важная задача для нашых сучаснікаў.

### *Список литературы*

1. Архітэктура Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: А.І. Лакотка (гал. рэд.) [ і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2006. – Т. 2: Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце (XV – сярэдзіны XVIII ст.) / А.І. Лакотка [і інш.]. – 2006. – 442 с. – С. 144 – 149, 165 –172.

*Качачун Александр Сергеевич*, студент ФИТиУ, Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, karachun99@mail.ru
*Пархоменко Александра Сергеевна*, студентка ФИТиУ, Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, кандидат исторических наук Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, доцент, Mikalayeva@bsuir.by.

Библиотека БГУИР